# ЗА ДВА КРОКІ АД... ПЕРАМОГІ



**«Next to you». Тэатр сучаснага танца «ВОРТЭКС» (Масква).**

СВЯТЛАНА ГУТКОЎСКАЯ

На апошнім фестывалі сучаснай харэаграфіі ў Віцебску было паказана 17 аднаактовых балетаў і 17 харэаграфічных мініяцюр. Канкурсанты прадстаўлялі восем краін — Беларусь, Расію, Малдову, Эстонію, Літву, Германію, Польшчу і Кітай.

Толькі вельмі наіўныя людзі могуць чакаць, што фестывальная праграма складзецца з шэдэўраў. Гэта немагчыма. У мастацтве заўсёды існуюць сярэдні ўзровень, «адходы вытворчасці», а колькасць выдатных, тым больш геніяльных твораў даволі невялікая. Сэнс і мэта фестывалю ў тым, каб адкрыць шлях да гледача розным творчым індывідуальнасцям, паказаць лепшае, на што яны здольныя, і такім чынам своечасова заўважыць, не прапусціць выдатныя творы, якія трапляюцца ў агульнай плыні, вылучыць і падтрымаць найбольш адораных харэографаў і таленавітых выканаўцаў.

На гэты раз Гран-пры фестывалю быў прысуджаны харэаграфічнай мініяцюры «Рыфмы гармоніі», заснаванай на лексіцы класічнага танца, афарбаванага элементамі сучасных танцавальных сістэм (яе выконвалі салісты Ансамбля песні і танца Кітайскай арміі).

Прынцыпова важнай для нас сталася перамога ў конкурсе балетмайстарскіх работ дуэта з Гродна. Першы раз за ўсю гісторыю фестывалю прадстаўнікі беларускай харэаграфіі падняліся так высока ў творчым спаборніцтве з замежнымі прадстаўнікамі сучаснага танца. Конкурсны твор В.Лабоўкінай і Ж.Маглыш (абедзве — выхаванкі харэографа Д.Куракулава) «За два крокі ад ...» (на музыку А.П'яцолы) уразіў і журы на чале з В.Елізар'евым, і экспертны савет, і гледачоў, і таму цалкам заслужана атрымаў 1-ю прэмію ў намінацыі «харэаграфічная мініяцюра».



Тэндэнцыя да зніжэння духоўнай напоўненасці харэаграфічнага мастацтва, якая, як мяркуюць крытыкі, закранула ў апошні час не толькі балетмайстарскую, але і выканальніцкую творчасць, абмінула стваральнікаў гэтай работы, якія адначасова выступілі тут і ў ролі выканаўцаў. Пластычны матэрыял аказаўся для іх блізкім і эмацыянальна перажытым. Яны не проста прадэманстравалі ўменне выдатна рухацца, лёгка выконваючы тэхнічна складаныя элементы, але самазабыўна жылі ў пластычным дзеянні, адгукнуўшыся на яго сэрцам і душою, і стварылі ў выніку незабыўны мастацкі вобраз. Паказанае сцэнічнае дзеянне, драматургічную аснову якога склалі супярэчлівыя адносіны між прадстаўнікамі маладога пакалення, захапіла ў палон з першых хвілін і прывабіла тонкімі інтанацыйнымі адценнямі, шматлікімі акцёрскімі дэталямі, яркімі тэатральнымі элементамі. Арганічным падаліся ўжыванне кінакадраў, музычных паўз, змена сцэнічных касцюмаў, маніпуляцыі з тканінай. Адбылося зрокавае ўвасабленне самой прыроды чалавечых адносін, дзе прыязнасць і антыпатыя, шчырасць і адчужанасць, прыгажосць і пачварнасць яднаюцца ў штосьці цэласнае.

Беларусь на фестывалі з годнасцю прадстаўлялі як добра вядомыя калектывы (гурт сучаснай харэаграфіі «Тад» з Гродна, студыі Д.Юрчанка і «Паралелі» з Віцебска, ансамбль кафедры харэаграфіі БДУ культуры і мастацтваў), так і дэбютанты — нядаўна створаны праект з Мінска пад назвай «D.O.Z.C.K.I».

Лідэр групы «Тад» і пастаянны ўдзельнік IFMC Д.Куракулаў, за творчасцю якога так цікава сачыць, паказаў аднаактовы балет «Бывай, паверхня!» на цудоўную музыку кампазітара А.Залётнева. Твор вылучаўся лексічнай вынаходлівасцю і багатай вобразнай асацыятыўнасцю, але, на мой погляд, яму пашкодзілі празмерная пластычная «шматслоўнасць» і зацягнутасць дзеяння.

Маладыя выканаўцы з Эстоніі, удзельнікі трупы «Fine 5 Dance Theatre», выступілі з пранікнёным дуэтам «A spot, 2 shadows». Твор прывабіў бясконцай кантыленай, калі кожны рух нібы нараджаецца з папярэдняга і, здаецца, немагчыма перапыніць гэты чароўны ланцужок пластычнага дзеяння.



**«Я, каханне і натоўп». Харэограф М.Бартэлт (Швейцарыя).**



ным аказаўся спектакль «Next to you» («Побач
ананні Тэатра сучаснага танца «ВОРТЭКС»
ўны акцэнт у ім быў зроблены на арыгіналь-
прыёмах арганізацыі пластычнага матэрыялу
ў прасторы, што само па сабе выклікала моцнае эстэтычнае задавальненне. У балеце «Простыя рэчы» малдаўскай групы сучаснага танца і перформансу «VOICES» і выбары выразных сродкаў арганічна адлюстраваўся нацыянальны каларыт.

Спецыяльную прэмію імя Я.Панфілава атрымала харэограф з Масквы Л.Аляксандрава за балет «Падарожжа супраць ветру» ў выкананні Тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі. Стваральніца яркага спектакля, здаецца, знаходзіцца пад уплывам творчасці бясспрэчна таленавітых і прызнаных мэтраў сучаснага танца В.Поны і А.Пепляева, але яна ўдала і па-свойму развівае іх мастацкія знаходкі. В.Кастэль, якая прадстаўляла Беларусь, сваю пастаноўку з выразна выяўленым элементам брэйк-данса ажыццявіла з танцавальнай групай Берлінскага універсітэта драмы і танца.

У рамках гасцявой праграмы ўпершыню на віцебскай сцэне выступіў швейцарац М.Бартэлт з балетам «Я, каханне і натоўп» у пастаноўцы Ж.Морарда. У камерным, амаль інтымным па ступені ўвасаблення патаемных чалавечых пачуццяў творы няма бар'ераў паміж музыкай і словам, танцам і выявай на экране, сінтэз якіх мае адну мэту — сугучнасць уласным асацыяцыям гледачоў, заснаваным на іх асабістым досведзе. «Эксцэнтрык-балет Сяргея Смірнова» прапанаваў свой новы твор — данс-спектакль «Вышэй за неба», прэм'ера якога адбылася нядаўна. На жаль, твор пакінуў уражанне толькі папярэдняга накіда, эскіза да спектакля.

Нярэдка даводзіцца чуць: як цяжка харэографу, стваральніку сучаснай харэаграфіі — яго ніхто не разумее, ён сутыкаецца з праблемай непрымання яго вобразнага мыслення і пластычнай мовы. Але часта цяжка і гледачу, які не можа разабрацца ў тым, што ён бачыць на сцэне. Як на гэта «новае» рэагаваць, што ў ім шукаць? «Дэшыфроўка» нязвыклых вобразных і пластычных сімвалаў, да якіх звяртаецца сучасны пастаноўшчык, каб адлюстраваць шматвобразны і шматфарбны свет, вымагае ад гледачоў і пэўных разумовых намаганняў, і этнакультурных ведаў. Можна, праўда, неразуменне ператварыць у пазіцыю, у ацэнку, бо гэта — свайго роду ахоўная рэакцыя супраць навацый, якія палохаюць. «Хіба гэта мастацтва?» — пытанне, якое часта гучыць на абмеркаваннях сучасных твораў, далёка не заўсёды сведчыць пра неразвітасць і эстэтычную безнадзейнасць гледачоў або адкрытую слабасць прапанаваных твораў. Такі пункт гледжання выяўляе эстэтычны стрэс, фрустрацыю, паразу ўспрымання пры сутыкненні з нечаканымі ўражаннямі.



**«За два крокі ад...»**
**Праект В.Лабоўкінай і Ж.Маглыш (Гродна).**

Фестываль сучаснай харэаграфіі праводзіцца не дзеля таго, каб некага ў нечым пераканаць. Фестываль можа і павінен абудзіць мастацкую свядомасць, выклікаць у гледача жаданне задумацца, а гэта значыць — часцей глядзець сучасныя творы, вучыцца іх разумець.

Мадэрн, постмадэрн, contemporary dance, новы танец... Якія яшчэ будуць найменні? Сучасны танец таму і сучасны, што хутка адгукаецца на змены мастацкага ўспрымання.

**«Рыфмы гармоніі». Ансамбль песні і танца Кітайскай арміі.**